го, рассмотрены варианты снижения вредных воздействий с помощью использования альтернативных источников энергии. Программа предназначена для экологического образования школьников старших классов и студентов неэкологических специальностей.

***Охраняемые парки Беларуси***

Программа содержит данные об охраняемых садово-парковых объектах на территории Беларуси. Из неё можно узнать сведения об истории парков, их современном состоянии и путях использования, а также выдержки из законов об охране. По каждому из охраняемых объектов содержатся сведения о композиции. Программа ориентирована на эстетическое воспитание школьников и предназначена для старших классов средних школ или других специализированных учебных заведений.

Умелое использование в учебном процессе компьютеров и компьютерных обучающих программ позволяет добиться того, чего не в состоянии сделать учебник – вызвать интерес к данной теме и ко всему процессу обучения.

ЛИТЕРАТУРА

1. Вронский В. А. Прикладная экология. Ростов-на-Дону. Издательство "Феникс", 1996.
2. Состояние природной среды Беларуси. Экологический бюллетень 1995 года / Под общей редакцией чл.- корр. АНБ В. Ф. Логинова. Минск, 1996.

УДК 808.26 – 07

Н. Я. Савіцкая, ст. выкл.

## РЭФЕРАТ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

The article tells about skills and habits of the first year students while writing summary and its presentation to the students' audience in the form of a report.

Выхаваўчыя задачы заняткаў перш за ўсё рэалізуюцца праз змест вучэбнага матэрыялу, які выкладаецца на занятках або самастойна вывучаецца студэнтамі. Вось чаму так важна прадумаць змест дзейнасці выкладчыка і студэнтаў, падабраць адпаведныя выхаваўчыя прыклады, факты, практыкаванні, скіраваць практычную дзейнасць студэнтаў, падвесці да самастойных вывадаў, абагульненняў. Асабліва важная задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб у змесце любой тэмы вучэбнага прадмета здолець убачыць, знайсці, вылучыць

светапоглядную ідэю, асноўныя філасофскія, маральныя, эстэтычныя палажэнні, якія вынікаюць з вывучэння дадзенага пытання. Гэту задачу спрабуюць рэалізаваць на сваіх занятках выкладчыкі кафедры беларускай мовы.

На практычных занятках беларускай мовы ў вучэбных групах першага курса студэнты чытаюць або расказваюць падрыхтаваныя імі даклады на актуальныя тэмы нашай рэчаіснасці.

Выхаваўчая праца са студэнтамі праводзіцца ў час выбару тэмы рэферата, яго напісання, выступлення з ім перад студэнцкай аўдыторыяй і пры яго абмеркаванні. Выбар адной з прапанаваных тэм дазваляе студэнту ацаніць свае магчымасці, абгрунтаваць выбар зацікаўленасцю тэмай, жаданнем паглыбіць і пашырыць валоданне гэтым матэрыялам або пазнаёміцца з невядомай з'явай рэчаіснасці, гісторыі, культуры Беларусі, пазнаёміцца з ёю самому і праз сваю зацікаўленасць тэмай дасягнуць адпаведнай рэакцыі ў аўдыторыі , г. зн. зацікавіць яе, данесці не толькі новую інфармацыю, але і выклікаць станоўчыя эмоцыі праз адлюстраванне багацця беларускай культуры, што дапамагае выхаваць годнасць і гонар за Бацькаўшчыну, за нацыю.

Напісанне рэферата выхоўвае адказнасць студэнта за ўзятыя на сябе абавязкі да пэўнага тэрміну напісаць рэферат, вучыць уменню размяркоўваць свой час, ацэньваць свае магчымасці, якасна рабіць запланаваную справу, вучыць планаваць сваю дзейнасць і дасягаць выканання гэтага плана.

Падчас працы над рэфератам студэнт авалодвае навыкамі пошукавага чытання (пошук інфармацыі да тэмы ), выбірае галоўны, неабходны для дадзенай тэмы матэрыял, групуе яго ў лагічнай, храналагічнай паслядоўнасці, адбірае найбольш яркія, характэрныя прыклады, праводзіць сувязь з рэаліямі сённяшняй рэчаіснасці, падводзіць да вывадаў па тэме.

Гэта творчая праца з элементамі навуковага даследавання ў студэнтаў першага курса выхоўвае шэраг такіх якасцяў, неабходных для навучання, як лагічнасць думкі, самастойнасць, адказнасць за выбар, абгрунтаванне выбару.

Патрабаванне да прынятай пабудовы рэферата, даволі жорсткіх рамак пры афармленні тытульнага ліста і спіса выкарыстанай літаратуры выхоўвае акуратнасць, уменне падпарадкоўваць сваё бачанне афармлення пэўным нормам, стандартам, знаёміць з аўтарамі, назвамі кніг, выдавецтваў, што павышае агульную адукацыю студэнта, пашырае яго веды і ўвогуле агульны ўзровень культуры і адукацыі.

Выступленне з падрыхтаваным дакладам у сваёй групе (у разумнай і патрабавальнай студэнцкай аўдыторыі – на першым курсе ў першым семестры гэта яшчэ не калектыў, а толькі знаёмства аднаго з адным, расстаноўка акцэнтаў, вылучэнне лідэра) выпрацоўвае ўменне справіцца з хваляваннем, выпрабоўвае студэнта на ўменне трымаць сябе найлепшым чынам, сканцэнтравацца, авалодаць аўдыторыяй, зацікавіць сваім выступленнем, данесці новую інфармацыю.

Уважлівае слуханне студэнтамі дакладчыка патрабуе ўмення не адцягваць сваю ўвагу на нешта іншае, засяродзіцца на дадзенай тэме, вылучаючы асноўны матэрыял і занатоўваючы яго, акрамя таго, напісанне кароткага канспекта прывучае студэнтаў да працы. Яны ўдасканальваюць навыкі канспектавання, увогуле вучацца вучыцца. А пасля, абапіраючыся на занатаваны матэрыял, даюць вусную рэцэнзію на выступленне дакладчыка.

Абмеркаванне праслуханага даклада дазваляе студэнту выказаць уласныя погляды, уступіць у дыскусію з сябрамі, якія інакш ацэньваюць тыя ці іншыя пытанні. Такія дыскусіі выхоўваюць маўленчую культуру і этыкет зносін, развіваюць уменне сфармуляваць і выказаць уласную думку, стымулююць разнастайнасць поглядаў, адточваюць маральную пазіцыю саміх студэнтаў, рыхтуюць да рэальнага жыцця, дзе нязменна сутыкаюцца ідэі, характары, дзе неабходна ўмець хутка адрозніць рэальныя і ўяўныя каштоўнасці і інш.

Акрамя таго, напісанне рэфератаў на тэмы, звязаныя з пытаннямі беларускай мовы (гісторыі яе развіцця і сучасным станам), з дзейнасцю знакамітых беларускіх дзяржаўных, культурных, навуковых дзеячаў, асветнікаў і адраджэнцаў, з гістарычнымі, сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі падзеямі, якія доўгі час не мелі належнага асвятлення ў вучэбнай і навукова-папулярнай літаратуры, дае магчымасць запоўніць «белыя плямы» нашага ўяўлення аб беларускай нацыі, яе гістарычным і культурным развіцці, вызначыць месца Беларусі і беларусаў сярод іншых этнасаў і культур на Зямлі, выхоўвае і паглыбляе нацыянальную свядомасць, дазваляе адчуць гонар за сваю Радзіму і суайчыннікаў, будзіць цікавасць да сваёй гісторыі, нараджае жаданне як мага больш даведацца пра беларускія імёны ў гісторыі, культуры і навуцы не толькі Беларусі, але і ўсяго свету. Усё гэта выхоўвае так неабходнае беларусам пачуццё патрыятызму, адказнасці за лёс беларускай дзяржавы і нацыі, дапамагае адчуваць сябе асобай, здольнай заняць дастойнае месца на шляху нашай будучыні.